**Мартыненка К.А.,** студэнт ФЗН 413 гр.
Навуковы кіраўнік – Матвейчык С.В.

# ТЭМАТЫКА АРНАМЕНТАЎ У БЕЛАРУСКАЙ НАРОДНАЙ ВЫШЫЎЦЫ І ТКАЦТВЕ

Што мы ведаем пра беларускі арнамент? Без спецыяльных ведаў – амаль нічога. Але зацікаўленасць беларускім арнаметам перыядычна аднаўляецца. Маладое пакаленне беларусаў усё часцей набывае ў краме вышытыя майкі, майкіз намаляваным арнаментам, а таксама розныя аксесуары з выявай элементаў арнамента. Часцей пачалі сустракацца у магазінах тавары з традыцыйнымі беларускімі арнаментамі.

Пад уплывам замежнай моды упрыгожваць своё цела татуіроўкамі наша моладзь стала на сваім целе маляваць беларускі арнамент і яго элементы.На жаль, многія юнакі і дзяўчаты, пагнаўшыся за модай, не заўседы ведаюць значэнні сімвалаў, якія выяўляюць на сваім целе.

Тэндэнцыя апошніх гадоў – упрыгожванне сваіх аўтамабіляў. І тут мы можам сустрэць беларускі арнамент. Але сказаць, што гэта сапраўды беларускі арнамент, не заўседы выйдзецца. А таму гэта адбываецца, што моладзь выбірае пэўны арнамент з пункту гледжання прыгажосці, прывабнасці, і выпадкова ён можа аказацца украінскім ці рускім, а не беларускім. Відавочна неглыбокае разуменне асаблівасцяў мастацтва арнамента.Часта можна убачыць дэфарміраваны арнамент: выцягнуты пагарызанталі ці вертыкалі.

Чым жа адметна тэматыка беларускага арнамента?

Беларускіўзор – не простапрыгожыякрыжыкі, квадрацікі і птушачкі. А на самой справе для нашых продкаў гэта быў не проста прыгожы арнамент, ашто ні узор – то сімвал. У тканых і вышываных

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

матывахзашыфрованы аповяд пра жыццё народа, стасункі з прыродай і паміж сабой. І нярэдка, узяўшы рушнік у свае далоні, можна было прачытаць долю жанчыны, якая яго вышывала [2]. Сапраўды, на тканых вырабах беларусаў сустракаюцца арнаменты, у якіх нават зашыфраваны загадкі. На жаль, сёння не ўсе могуць расшыфраваць тканае ці вышытае пасцельнае.

Вельмі многа матэрыяла пра значэнне сімвалаў у беларускім арнаменце сабраў М.С.Кацар [2]. На аснове даследавання ўзгаданага аўтарамы можам убачыць і вылучыць наступныя вобразы у арнаментыцы беларусаў: вобраз ўраджаю і ўрадлівасці, вобразы маці, вобраз роднай Беларусі, вобразы святаў, вобразы яднання песень і кветак, мелодыі і арнаменту, вобразы язычніцкай міфалогіі, вобразы кахання, вобразы чалавека, сям‘і, дзяржавы, вобразы веры [2]. Арнамент не проста асобны знак, гэтасістэма, у першую чаргу, кампазіцыя, рытм.Часта на адной вышытай кашулі або нафартуху можна налічыць да дзясятка разнастайных швоў: розныя віды арнаментальных і ўпрыгожвальных падліковых швоў, мярэжак, краявых швоў, злучальных і інш.

Арнамент, вышыты ці вытканы на тканіне, нясе сімвалічную нагрузку, з'яўляецца знакам, закліканым абараняць чалавека. Арнаментацыя адзення, выкананая посродкам вышыўкі, мае значэнне абярэга. Развіццё тэхнікі вышывання дазволіла чалавеку перанесці на тканіну разнастайныя ўзоры, знакі арнаменту, якія склаліся ў культуры і маюць пэўнае сімвалічнае значэнне.

Арнаментыка, якую данесла да нашага часу традыцыйная вышыўка і ткацтва, надзвычай разнастайная. Яна складаецца пераважна з геаметрычных і пазнейшых па паходжанні геаметрычна-раслінных арнаментаў. Асноўнымі элементамі беларускага арнамента, як і ў іншых славянскіх народаў, з'яўляюцца ромб ў яго розных варыянтах: у выглядзе

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

квадрата, пастаўленага на вяршыню, з чатырма кропкамі, з адросткамі і г.д., а таксама крыжы, разеткі-зоркі, прамыя і зігзагападобныя лініі.

Асноўныя элементы арнаменту і іх назвы наступныя: «крыж»; ромбічныя «кругі», «нашывана кружэчкамі», «вочка», «нашывана вочкамі», «скрыначка», «скрынка», «глухоўка», «чаўны», «чаўнік»; ромбічныя з адросткамі «крукі», «лапа», «лапа вялікая», «кучаравая лапа», «вядзьмедзіна лапа», «чаўнок», «рэдзька», «каробка», «круча»; васьмілепястковая разетка «цвет», «васьмірожка», «рожа», «крывуля», «зорька» [3].

Разнастайнасць беларускага вышытага і тканага арнаменту прадстаўлена разнастайнымі варыянтамі злучэння асобных геаметрычных матываў у розныя па структуры і рытму кампазіцыі. Часцей усяго сустракаюцца узорныя палосы, стужкі, бардзюры, у якіх адзін або два матывы паўтараюцца ў пэўным рытме. Злучэнне палос рознай шырыні дае бясконцыя варыянты арнаментальных кампазіцый. Другі від кампазіцыйнай пабудовы - прамая і касая сетка, а трэці -разетка (крыжы, васьмілепястковыя зорачкі, асобныя кветкі – розы, лісты ці маленькія букеты). У народзе называюць вышыўку звыкарыстаннем разеткі «цвяцістае нашыванне».

Кожная эпоха пакідае свій адбітак у арнаментыцы. І гэта натуральна. Для традыцыйнай вышыўкі і ткацтва канца 19-га-пачатку 20-га стагоддзя характэрна чырвона-белая гама. Чорны выкарыстоўваўся толькі ў якасці дадатковага колеру або быў прыкметай ўплыву іншай этнічнай традыцыі. Арнамент быў геаметрычным. Напрыканцы 19-га стагоддзя побач з геаметрычным арнаментам атрымаў распаўсюджанне і раслінны, традыцыйная чырвона-белая гама трансфарміравалася ў паліхрамную. Змяніўся светапогляд чалавека імода змянілася, таму і вышыўка стала іншай[3].

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

Калі паўстае пытанне выкарыстання арнамента для афармлення сучасных рэчаў, напрыклад вокладкі на пашпарт ці тэлефон, то ніхто не абірае каляровыя ўзоры, вышыўку паліхромнай гладдзю, а набывае тое, штоадпавядаенашамуўяўленнюпра беларускасць (чырвона-белы геаметрычны арнамент).

Арнаментыка з‘яўляецца часткай культурнай спадчыны Беларусі, адносіцца да ўнікальных культурных каштоўнасцяў і выклікае гонар за сваю культуру. Вышываючы арнаменты, беларусы ўкладвалі ў іх усе свае жаданніі мары: кахання, шчасця, здароўя, ўраджаю і думкі пра будучыню.Вышыўка захоўвае і перадае гледачу інфармацыю духоўнага плана, энергію свайго творца, так як яна з‘яўлялася ў большай ступені абарягам для нашых продкаў. Уваходжанне беларускага арнамента у сучасны прадметны свет дазваляенапоўніць паўсядзённае жыццё спрадвечнымі каштоўнасцямі нашых продкаў.

---

1. Арнаменты Падняпроўя / Нячаева Г.Р. і інш. – Мінск: Бел. навука, 2004. – 606с.

2. Кацар, М.С. Белорусский орнамент: Ткачество. Вышивка/ М.С. Кацар — 3-е изд. — Минск: Беларусь, 2013. – 224 с.

3. Лобачевская, О.А. Белорусский народный костюм: крой, вышивка и декоративные швы / О.А. Лобачевская, З.И.Зимина. – 3-е изд. – Минск: Беларуская навука, 2016. – 279 с.

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ